мову А. Бурсава; мастак І. Гардзіёнак]. - Мінск : С. Ю. Татарнікава, 2012. - 146, [5] с.
2. Краўцэвіч, А. К. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. Ад пачатку гаспадарства да каралеўства Літвы і Русі (1248—1341 г.) / А. Краўцэвіч; [навуковы рэдактар В. Голубеў]. - Гародня [Гродна]. - Уроцлаў [Вроцлаў] : Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego we Wrocławiu, 2013. - 184, [1] с.
3. Клюг Э. Княжество Тверское (1247—1485 гг.). Тверь, 1994. – 432 с.
4. Новосельский, В.В. История Великого княжества Литовского от рождения до Люблинской унии (1237—1569), или 333 года борьбы за возвышение и выживание. Великий князь Гедимин (1316—1341) / В. В. Новосельский. - Минск : Элайда, 2012. - 213, [1] с.
5. Полехов С.В., Браки князя Свидригайла Ольгердовича // По любви, въ правду, безо всякие хитрости. Друзья и коллеги к 80-летию В.А. Кучкина. Сб. ст. Москва, 2014 – с. 235-268
6. Tęgowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów / pod redakcją Marka Górnego. – Poznań-Wrocław, 1999 – T. 2. – 320 s.
7. Wolff J. Ród Gedimina. Dodatki i poprawki do dzieł K. Stadnickiego: „Synowie Gedymina", „Olgierd i Kiejstut" i „Bracia Władysława Jagiełły". – Kraków, 1886 – 325 s.

Лянцэвіч В. М.
МІУ (Мінск)

## Дзяржаўнае рэгуляванне гарадской гаспадаркі на беларускіх землях у XIV – XVI стст.

Эпоха Вялікага княства Літоўскага адыграла вырашальную ролю ў фарміраванні беларускага горада, усталаванні яго не толькі як адміністрацыйнага, палітычнага, ваеннага і культурнага цэнтра, але, перш за ўсё, як цэнтра эканамічнага, дзе ажыццяўляецца актыўнае развіццё гандлёвых адносін і рамеснай вытворчасці. Беларускі горад феадальнай эпохі – гэта часцей за ўсё невялікае паселішча з насельніцтвам у 1,5 – 3 тыс. жыхароў. Буйнейшыя, насельніцтва якіх налічвала 10 і больш тыс. чал., сустракаліся вельмі рэдка. Грамата вялікага князя Казіміра ў 1449 г. пералічвала ў дзяржаве 15 "лепшых"



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

гарадоў, сярод якіх згадваліся беларускія Полацк, Бярэсце, Віцебск, Гародня, Драгічын, Менск, Наваградак, Слуцк. Самы буйны, Полацк, у сяр. XVI ст. налічваў 50 тыс. жыхароў. Гэта быў горад з высокаразвітым рамяством, цэнтр мясцовага рынку і актыўны ўдзельнік замежнага гандлю. Вядомы дагаварныя граматы XIII ст. полацкіх і віцебскіх князёў з Рыгай і Готландам (1263, 1265 гг.) [3, с. 24 - 26] аб свабодзе гандлю. Пасля ўключэння гэтых гарадоў у склад ВКЛ на дагаворнай аснове, з прадастаўленнем шырокай аўтаноміі, ўлады садзейнічалі далейшаму развіццю тут знешнегандлёвых сувязяў, якія рэгуляваліся ў гэты час звычаёвым правам.

У канцы XIV – пач. XV ст. пачынаюць складацца лакальныя, рэгіянальныя рынкі, назіраецца тэндэнцыя да фарміравання ўнутранага рынку ВКЛ. Актывізуюцца знешнегандлёвыя стасункі, галоўным чынам заходнебеларускія гарады наладжваюць трывалыя сувязі з Еўропай. У гэтых умовах нормы вуснага звычаёвага права, якімі рэгуляваліся павіннасці гарадскога насельніцтва (а з канца XIV ст. адзначаецца працэс фарміравання мяшчанскага саслоўя) і гарадская гаспадарка, перастаюць задавальняць патрэбы рэгулявання эканамічных адносін. Дзяржаўная ўлада ў асобе вялікага князя пачынае выдаваць вялікакняскія прывілеі і граматы, якія рэгламентуюць эканамічныя адносіны ў горадзе. Можна вызначыць некалькі накірункаў, якія і складалі асноўныя вектары прававога рэгулявання гарадской гаспадаркі. Гэта рэгламентацыя гарадскога самакіравання, а таксама рамяства, гандлёвых адносін, прадпрымальніцтва і зямельнага права.

Прывілеі на самакіраванне прадстаўлялі сабой спецыяльныя акты, якія выдаваліся толькі для гараджан вярхоўнай уладай ВКЛ альбо яго ўладальнікам ў тым выпадку, калі горад ці мястэчка належала прыватнаму феадалу. Напачатку XVI ст. больш за 40% паселішчаў гарадскога тыпу знаходзіліся пад юрысдыкцыяй буйных феадалаў [6, с. 70]. Гарады такім чынам аддзяляліся ад воласці і афармляліся як самастойныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і фінансава-гаспадарчыя адзінкі (У. Пічэта выкарыстоўвае тэрмін “саслоўна-адміністрацыйныя адзінкі” [12, с. 427]), а таксама набывалі прававую самастойнасць. Першымі грамату, якая давала самакіраванне, атрымалі жыхары Вільні



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

(22.03.1387), затым – Брэста (1390) і Гродна (1391). У граматах прадугледжваліся пэўныя гандлёвыя льготы для жыхароў і абмежаванні для не-гараджан; вызначаліся тэрміны кірмашоў і гандлёвыя дні на тыдні, рэгламентавалася рамесная дзейнасць. Гараджане вызваляліся ад некаторых феадальных павіннасцей, а тыя, што заставаліся, рэгламентаваліся не звычаёвым правам, як гэта было раней, а асобнымі прававымі актамі. Кожны горад атрымліваў сваю ўласную грамату, паколькі іх прававы стан, а таксама кола павіннасцей было неаднолькавым. Часам паселішчу даравалася частковае самакіраванне. Спроба ўвесці аднастайныя правы для мяшчан ўсіх гарадоў была зроблена толькі законам ад 18.04.1791 г. [10, с. 38].

Гарадское права, якое распаўсюджвалася на беларускіх землях, часта называецца Магдэбургскім, пры гэтым не ўлічваецца, што акрамя магдэбургскай тут дзейнічалі ў невялікай ступені і іншыя сістэмы права. В. Келер адзначае, што асобныя гарады Пінскага павета рэгуляваліся Кульмскім, а г. Сокал Драгічынскага павета –Ноймаркцкім гарадскім правам [7, с. 35 - 36]. Аднак пераважная колькасць гарадоў і мястэчак (З. Капысскі адзначае лічбу 28 для даследуемага перыяду [9, с. 26 - 41]) запазычылі самую папулярную на той час у Еўропе Магдэбургскую сістэму гарадскога самакіравання, якая спалучалася з мясцовымі традыцыямі, у прыватнасці, пры рашэнні найважнейшых для горада пытанняў немалую ролю адыгрывала раннесярэднявечнае “веча” [7, с. 35]. На працягу XV – XVI ст. граматы на самакіраванне атрымалі амаль усе буйныя і шэраг дробных беларускіх гарадоў.

Нормы гаспадарчага прававога рэгулявання ў феадальныя часы фарміраваліся ў межах цывільнага права, якое само яшчэ недастаткова поўна склалася як асобная галіна [15, с. 6]. На працягу XIV – пач. XVI ст. дзяржаўная ўлада рэгулявала асобныя пытанні, якія ўзнікалі ў межах канкрэтных населеных пунктаў. Толькі статутны перыяд (з XVI ст.) вызначыў узнікненне агульнадзяржаўных нормаў, якія тычыліся рэгулявання гарадской гаспадаркі.

У буйных гарадах налічвалася некалькі дзясяткаў рамесных прафесій. Ужо ў першай палове XVI ст. існавалі карпаратыўныя арганізацыі рамеснікаў (сотні ў Гародні, брацтвы ў Полацку і Менску,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

староствы – у Магілёве). Да канца XVI ст. за імі замацоўваецца назва "цэх". Вялікакняскія граматы дазвалялі ўсім гарадскім рамеснікам княства займацца рамяством і прадаваць свае вырабы, пры гэтым іх дзейнасць павінна была рэгулявацца Магдэбургскім правам [1, т. 2, с. 11; 76].

Дзейнасць цэхаў рэгулявалася ўласнымі статутамі. Першыя цэхавыя статуты зацвярджаліся гарадскім магістратам, але пазней, з канца XVI ст., кожны цэх імкнуўся атрымаць спецыяльную каралеўскую грамату [9, с. 93]. Вялікакняская грамата рамеснікам Менска ад 1552 г. ўтрымлівала патрабаванне абавязковасці ўключэння ўсіх рамеснікаў горада ў цэхавыя арганізацыі [11, с. 161]. Такім чынам, дазвол на рамесную дзейнасць атрымлівалі толькі чальцы цэхаў. Датай афіцыйнага стварэння ў Менску цэхавых арганізацый па агульнаеўрапейскіх прынцыпах лічыцца атрыманне вялікакняскага прывілея ад 16.07.1569 г., у якім агаворвалася першасная арганізацыя і цэхавая спецыялізацыя [18, с. 7]. Існаванне і дзяржаўная падтрымка цэхавых арганізацый садзейнічала развіццю ўнутранага рынку. А сам факт існавання цэхаў фарміраваў мяшчанскую свядомасць і карпаратыўную салідарнасць у феадальным грамадстве [18, с. 9]. Росквіт цэхавых аб'яднанняў на беларускіх землях прыпадае на канец XVI – перш. пал. XVII ст. Імкнучыся садзейнічаць развіццю гарадскіх рамёстваў, улады вызвалялі насельніцтва эканамічна развітых гарадоў (Вільні, Полацк, Навагродак, Менск) ад сумесных з воласцю цяглых і інш. павіннасцяў.

Значную долю даходаў скарбу складалі мытныя зборы з купцоў за перавоз па землях ВКЛ, увоз і вываз, а таксама продаж на мясцовых рынках разнастайных тавараў. Мыта плацілі і мясцовыя купцы, і замежныя "госці". Прычым не толькі грашыма, але і некаторымі таварамі (тканіны, футра). Для найбольш развітых у эканамічным плане рэгіёнаў улады маглі адмяніць мытныя зборы. Вялікакняскі прывілей Жыгімонта Кейстутавіча (1432) гарантаваў жыхарам Вільні права свабоды гандлю. А Казімір Ягелончык, даруючы віленскім мяшчанам у 1440 г. права не плаціць мыта на ўсёй тэрыторыі дзяржавы, спасылаўся на адвечныя звычаі, устаноўленыя яшчэ пры Альгердзе (другая палова XIV ст.). І калі ў XIV – XV ст. мыта плацілася і буйным феадалам, то ў



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

XVI ст. гэта стала дзяржаўнай манаполіяй. Статут 1588 г. утрымлівае дэталёвую рэгламентацыю мытных збораў (р. І, арт. 14, 29-31; р. IV, арт. 8) [17]. Толькі ў асобных выпадках права збору мыта магло здавацца ў арэнду. З сярэдзіны XVI ст. шляхта ВКЛ была вызвалена ад мытных збораў за вываз на продаж прадуктаў уласнай гаспадаркі; гэты стан працягваўся да 1764 г. Як бачым, дзяржава выкарыстоўвала мытную сістэму як рэгулятар знешнегандлёвай палітыкі [15, с. 10].

Такім чынам, у XVI ст. назіраецца актывізацыя працэсу ператварэння беларускіх гарадоў у гандлёва-рамесныя цэнтры, што абумовіла існаванне горада як самастойнага гандлёва-рамеснага фактару ў феадальнай эканоміцы ВКЛ. Да канца XVI ст. колькасць гарадоў – буйных цэнтраў рамяства і гандлю, адміністрацыйнай, рэлігійнай, культурнай і іншай дзейнасці – на беларускіх землях вырасла да 30-ці, а мястэчак – аграрна-рамесна-гандлёвых паселішчаў – амаль да 400 [2, с. 289]. У межах ВКЛ агульная колькасць гарадскіх паселішчаў дасягала 757 [6, с. 70]. З'яўленне прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак закранала інтарэсы кароны: яны складалі канкурэнцыю вялікакняжацкім і змяншалі даходы казны. Для рэгулявання гэтай праблемы заснаванне новага гарадскога паселішча патрабавала спецыяльнага прывілея. І і ІІІ Статуты ВКЛ забаранялі прыватным асобам ўсталёўваць новыя гандлёвыя пошліны. "Устава на валокі" (арт. 14) таксама ўтрымлівала забарону на арганізацыю новых таргоў на адлегласці бліжэй, за 3 мілі ад вялікакняскіх "месцаў". Аднак на практыцы жорсткія рэгламентацыі не заўсёды выконваліся, і ў ІІІ Статуце (р. І, арт. 29) з'явіўся дазвол на заснаванне гарадскіх паселішчаў без спецыяльных прывілеяў. Таксама Статут замацоўваў гарады як месцы для гандлю насельніцтва (р. ІІІ, арт. 25).

Пытанне прадастаўлення права таргоў і тэрмінаў іх правядзення таксама знаходзілася ў кампетэнцыі вялікага князя, паколькі асноўнай умовай іх існавання было ненанясенне эканамічнага ўрону ранейшым таргам. Мыта пад час праваядзення таргоў не спаганялася. Так, буйны знешнегандлёвы цэнтр на беларускіх землях, Віцебск, меў дазвол толькі на адзін кірмаш на год (на Св. Пятра), што тлумачыцца нежаданнем князя траціць істотны прыбытак [8, с. 70]. З другога боку, калі пэўны



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

горад спасцігала бедства, улады даравалі яму гандлёвыя паслабленні. У прыватнасці, прывілей 1525 г. вызваляў берасцейскіх месцічаў на 10 год [5]. Такім чынам, вызваленне ад гандлёвых падаткаў станавілася стымулам да развіцця гарадской гаспадаркі.

Яшчэ адной з неабходных умоваў эфектыўнага рэгулявання гандлю была наяўнасць стабільнай сістэмы мер і вагаў. Іх адзінкі вызначала дзяржаўная адміністрацыя яшчэ з часоў Вітаўта (пач. XV ст.). Мерныя падаткі адрозніваліся ў залежнасці ад роду прадметаў, але іх назвы (“вядро”, “ад галавы”, “палакотнае”, інш.) сведчаць аб старадаўнім звычаёвым праве і прысутнічаюць у вялікакняскіх прывілеях як здаўна вядомыя нормы. Кожны горад меў сваю сістэму мер і вагаў, якая замацоўвалася ў грамаце на самакіраванне. Эталоны мер рознага кшталту тавараў (напр., “бочка мерная”) утрымліваліся ў ратушы, а на гарадскім рынку стаяла важніца. Абавязковымі зборамі з гандляроў былі “важчае”, “мерны падатак”. Калі гандляр карыстаўся іншымі мерамі, з яго спаганялася 12 коп. штрафу, палова з якіх ішла гораду, а другая – пацярпеламу [8, с. 69]. Паступова дзяржава прыходзіць да ўніфікацыі мер і вагаў на ўсёй тэрыторыі ВКЛ. Статут 1588 г. утрымліваў патрабаванне ўвядзення ў межах дзяржавы адзінай сістэмы мер і вагаў, якая адпавядала б віленскай.

Грамата на самакіраванне даравала гораду яшчэ адну крыніцу стабільнага даходу – “права складу”: замежныя купцы-госці мелі права здаць свой тавар толькі па аптовай цане; гандаль у розніцу для іх дазваляўся толькі падчас кірмашоў і таргоў. На начлег “госці” таксама маглі спыняцца толькі ў адпаведных месцах. Так, у лісце вялікага князя Аляксандра да Віленскага магістрата (10.03.1502) ўтрымліваецца загад аб будаўніцтве гасціннага дома для размяшчэння замежных гандляроў, якія такім чынам будуць кантраляваўца ўладамі горада [1, т.3, с. 242]. Такія дамы таксама вызваляліся ад падаткаў на карысць дзяржавы.

Пад кантролем вышэйшых уладаў знаходзілася і самая прыбытковая прадпрымальніцкая справа – вінакурэнне. Гандляваць спіртнымі напоямі забаранялася не толькі падатковым саслоўям, але і шляхце. У Полацку, калі выяўляўся факт заняткаў шынкарствам ва ўласнай хаце, павінна было заплаціць штраф у 169 коп. (для параўнання:



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

за магдэбургскае права горад плаціў князю 200 коп.) [8, с. 71]. Гандляваць дазвалялася ў корчмах, гаспадары якіх павінны былі плаціць князю капчызну ці чопавае. Дзяржаўныя корчмы часта здаваліся ў арэнду гораду альбо асобным мяшчанам, але гандлявалі тут таксама за плату. Статут 1529 г. забараняў варыць піва ў корчмах без спецыяльнага дазволу ўладаў (р. III, арт. 17) [16]. Гэтую норму падцвярджае Статут 1588 г. (р. XIV, арт. 33).

Гарадскому насельніцтву вялікакняскіх гарадоў забаранялася валодаць землямі, а таксама свабодна імі распараджацца. Права валодання зямлёй належала гарадской абшчыне, але на практыцыі яго мелі і асобныя месцічы.

Як сведчаць шматлікія запісы гарадскіх актавых кніг, нягледзячы на забароны, яны закладвалі, прадавалі, завяшчалі, дарылі не толькі свае дамы, але і землі, что стала прычынай з'яўлення ў гаспадарскіх гарадах шляхецкіх юрыдыкаў [4, с. 92].

Па ўмовах аграрнай рэформы 1557 г. у вялікакняскіх гарадах і мястэчках, дзе яшчэ не дзейнічала гарадское права, таксама адбылося пераразмеркаванне падаткаў і павіннасцей. У залежнасці ад якасці глебы, землеўладальнікі павінны былі плаціць па 30, 40 ці 50 грошаў чыншу, а таксама 12 грошаў за талоку [13, с. 41].

Пасля правядзення рэформы павіннасці месцічаў сталі насіць выключна грашовы характар. Вымарачная гарадская маёмасць нават у гарадах з магдэбургскім правам адыходзіла ў фонд вялікага князя [14, с. 52].

Гарадская гаспадарка, такім чынам, мела пэўную ступень самастойнасці, але найбольш прыбытковыя справы знаходзіліся пад кантролем улады. Гэтыя ж справы найперш рэгламентаваліся ў ВКЛ пісьмовым правам.

Адбываецца працэс паступовага ўключэння гаспадаркі ВКЛ у агульнаеўрапейскі рынак, і ў ролі рэгулятара гандлёвых адносін выступаюць дзяржаўныя ўлады, якія сачылі за напаўненнем рынку таварам, ўводзілі пры неабходнасці манаполію на гандаль тым ці іншым таварам, садзейнічалі фарміраванню ўнутранага рынка.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

## Літаратура

1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1846–1853. – Т. 2 – 3.

2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Современная школа: Экоперспектива, 2007 – 20011. Т. 2. – 688 с.

3. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: Вуч. дапаможн. / Пад агульн. рэд. праф. А.Ф. Вішнеўскага, Я.А. Юхо. – Мінск: Акад. МУС РБ, 1998. – 311 с.

4. Голубева, Л.Л. Правы гараджан феадальнай Беларусі і іх удзел у грамадзянска-прававых адносінах [XV–XVI стст.] / Л.Л. Голубева // Прававая рэформа ў Рэспубліцы Беларусь: вопыт, праблемы, перспектывы: тэз. дакл. навук.-практ. канф., (24 – 25 крас. 1997 г.) / Гродзен. дзярж. ун-т, каф. грамадзян. права і працэса; адк. рэд. В.В. Скітовіч. – Гродна, 1997. – Ч. 1. – С. 90 – 92.

5. Довнар-Запольский, М.В. Акты Литовско-Русского государства /М.В. Довнар-Запольский. – М.: Унив. тип.,1899. – Вып. 1: 1390–1529 гг. – 258 с.

6. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: падручнік / Т.І. Доўнар. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014. – 416 с.

7. Келер, В.Б. Асноўныя віды гарадскога права на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага / В.Б. Келер // Бел. гіст. часоп. – 2013. – № 7. – С. 33 – 37.

8. Кісялёў, А.В. Дзяржаўнае рэгуляванне гандлю ў гарадах Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. / А.В. Кісялёў // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР: матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 27 лют. 2009 г.: у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т, Гіст. фак.; рэдкал.: А. І. Андарала [і інш.]. – Мінск, 2009. – Ч. 1. – С. 67–72.

9. Копысский, З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. – Минск, 1966. – 225 с.

10. Лопато, П.В. Граматы на магдэбургскае права гарадам Беларусі – крыніцы беларускага феадальнага права [канца XIV–XVIII стст.] / П. В. Лопато // Магдэбургскае права на Беларусі: матэрыялы навук.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

канф., прысвеч. 500-годдзю выдачы г. Мінску граматы на магдэбург. права, (Мінск., 26 сак. 1999 г.) / Беларус. дзярж. ун-т, Акад. М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, Беларус. недзярж. ін-т правазнаўства; рэдкал.: У.М. Хоміч [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 35–39.
11. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. /М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 1 – 527 с.
12. Пичета, В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве / В.И. Пичета; Под ред. В.И. Королюка и [др.]. – М.: Изд-во АН СССР, 1958. – 545 с.
13. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва в XV – XVI вв. Исслед. по истории соц.-экон., полит. и культур. развития / В.И. Пичета; Под ред. З.Ю. Копысского и [др.]. – М.: Изд-во АН СССР, 1961. – 812 с.
14. Пичета, В.И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии. Ч. 1: До конца XVI в. / В.И. Пичета. – Минск: Изд-е Наркомзема, 1927. – Микрофильм. – 26 см.
15. Сокал, С.Ф. Гістарычныя асаблівасці ўзнікнення і станаўлення прававога рэгулявання гаспадарчых адносін у Беларусі ў дасавецкі перыяд / С.Ф. Сокал // Сац.-экан. і прававыя далед. – 2012. – № 2. – С. 4 – 13.
16. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. / Под ред. акад. АН Литовской ССР К.И. Яблонскиса. – Минск: Изд-во АН БССР, 1960. – 254 с.
17. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на сучасн. бел. мову А.С. Шагун. – Мінск: Беларусь, 2010. – 207 с.
18. Цітоў, А.К. Менск – месца майстроў. Рамесныя цэхі XVI – XVIII стст. / А.К. Цітоў. – Мінск: “Беларусь”, 2002. – 110 с.

Паршанкоў А. А.
БДУ (Мінск)

## Цуды ў летапісанні Вялікага Княства Літоўскага XV – пачатку XVI стагоддзяў. Спробы класіфікацыі

Мінулае стагоддзе характэрызавалася для беларускай гістарыяграфіі станаўленнем трывалых поглядаў на гістарычнае развіццё краіны, паглыбленнем і пашыреннем ведаў аб яе мінулым. Беларускія



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm